# ПСІХАЛОГІЯ

УДК 37.015.3:378.1

*М. Ф. Бакуновіч*

## ПОГЛЯД НА ДЫНАМІКУ МАТЫВАЦЫЙНА-МЭТАВАЙ САМАРЭГУЛЯЦЫІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Працэс эфектыўнай дзейснай самарэгуляцыі здольны ажыццявіць чалавек, які з'яўляецца суб'ектам дзейнасці і суб'ектам працэсу самарэгуляцыі. Суб'ектныя якасці чалавека праяўляюцца і фарміруюцца ў ходзе развіцця. Развіццё — гэта «змены, што ўтвараюць разгалінаваны працэс, што змяшчае вузлы якасных змен, якія паслядоўна вынікаюць адзін з другога, лініі колькасных змен, што звязваюць іх паміж сабой» [1, с. 34].

Сучасная псіхалагічная навука паняцце «развіццё» суадносіць з паняццем «сістэма». У навакольным свеце не існуе сістэм, што знаходзяцца па-за развіццём і, у сваю чаргу, няма развіцця па-за якой-небудзь сістэмай. Развітасць сістэмы вызначае спецыфіка яе арганізацыі, якая характарызуецца «колькасцю разнародных элементаў (ступень разнастайнасці), што ўваходзяць у сістэму, колькасцю розных іх узроўняў (ступень іерархічнасці) і колькасцю, разнастайнасцю і ўпарадкаванасцю сувязяў паміж элементамі» [2, с. 28—29]. Такім чынам, працэс развіцця абумоўлівае змены ўнутры сістэмы, забяспечвае рост яе арганізацыі ў напрамку дыферэнцыяцыі ды іерархічнай упарадкаванасці элементаў.

Прадметам нашага даследавання з'яўляецца дынаміка матывацыйна-мэтавай самарэгуляцыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Тлумачэнне развіцця сістэмы самарэгуляцыі прадугледжвае вызначэнне змен, а таксама выяўленне прычын, фактараў і ўмоў гэтых змен.

Вядома, што асноўным спосабам існавання псіхічнага з'яўляецца яго быццё ў якасці працэсу, дзейнасці, ды і само псіхічнае як працэс ёсць нешта дынамічнае [3]. Працэс самарэгуляцыі пачынаецца з матыву і мэты, а завяршаецца вынікам, дасягненнем намечанай спачатку мэты. Матыў і мэта выступаюць у якасці фактараў развіцця самарэгуляцыі. Яны ўтвараюць своеасаблівы «вектар» самарэгуляцыі, які вызначае яе напрамак, а таксама велічыню намаганняў, што развівае суб'ект пры яе выкананні. Гэты вектар выступае ў ролі

сістэмастваральнага фактару, які арганізуе ўсю сістэму самарэгуляцыі, тыя працэсы, што фарміруюцца і «разгортваюцца» ў ходзе дзейнасці [4].

Самарэгуляцыя можа ажыццяўляцца двая кім чынам. У першым выпадку чалавек здзяйсняе самарэгуляцыю на аснове патрабаванняў акаляючага асяроддзя, у другім — самастойна, па ўласнаму жаданню ў працэсе ўсведамлення матываў дзейнасці і, адпаведна, актуальных нерэалізаваных патрэбнасцяў. Значыць, матывацыйна-мэтавая самарэгуляцыя разгортваецца ці на аснове зыходна зададзеных мэт, ці самастойна выпрацаваных (сфармуляваных) мэт. Такім чынам, дынаміка матывацыйна-мэтавай самарэгуляцыі ёсць развіццё суб'ектнасці чалавека і самарэгуляцыі як сістэмы.

На наш погляд, развіццю матывацыйна-мэтавай самарэгуляцыі ўласцівы працэсуальны характар. Яно ажыццяўляецца па меры таго, як студэнт становіцца суб'ектам гэтага працэсу. Станаўленне студэнта суб'ектам працэсу самарэгуляцыі характарызуюць змены, што адбываюцца ў яго на ўзроўні суб'ектыўнага кантролю (інакш: суб'ектыўнай уключанасці ў дзейнасць), матываў, у тым ліку матываў дасягнення і працэсаў мэтаўтварэння.

Студэнцтва ўяўляе сабой группу людзей, арганізацыйна аб'яднаных вучобай у інстытуце вышэйшай адукацыі [5]. Вучэбная дзейнасць у ВНУ з'яўляецца асноўнай. Яна «найбольш інтэнсіўна ўплывае на развіццё псіхалагічных працэсаў і ўласцівасцяў асобы студэнта, набыццё ім прафесійна важных ведаў, навыкаў, уменняў» [6, с. 109] і выступае ў якасці ўмоў змен. У працэсе ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці адбываецца ўласны і прафесійны рост студэнта: ён вучыцца самастойна вызначаць кірунак асобаснага і прафесійнага развіцця.

Ідэя актыўнага, дзейснага суб'екта, увасобленая ў здольнасці самім ажыццяўляць самарэгуляцыю, дазваляе зрушыць акцэнты ў вучэбнай дзейнасці з «абучэння» на «вучэнне». Выкарыстанне студэнтамі ўласных намаганняў у працэсе ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці забяспечвае эфектыўнасць працэсу пазнання, вызначае яго ўплыў на развіццё асобы. Такі суб'ект здольны набываць веды, уменні, навыкі, разумець заканамернасці аб'ектыўнага свету самастойна, інакш кажучы, ажыццяўляць самарэгуляцыю працэсу пазнання. Самарэгуляцыя вучэбнай дзейнасці ўвасабляецца ў самарэгуляцыю пазнання і ўяўляе сабой працэс набыцця ведаў у працэсе знаходжання і перапрацоўкі інфармацыі.

Ажыццяўленне суб'ектам рэгуляцыі вучэбнай дзейнасці пачынаецца з працэсу стварэння мэты на аснове ўсведамлення

матываў дзейнасці і, такім чынам, актуальных патрабаванняў. Сфармуляваныя суб'ектам мэты дзейнасці, канкрэтызаваныя і аб'яднаныя ў пэўную іерархію, дакладна абазначаюць вобраз будучага выніку і вызначаюць эфектыўнасць далейшай рэгуляцыі. Матывы, у сваю чаргу, падтрымліваюць кагніцыі дзейнасці і патэрны паводзін на шляху дасягнення мэты: стымулююць дзейнасць, рэгулююць прыкладзеныя намаганні; матывы дасягнення забяспечваюць арыентацыю на поспех у дзейнасці.

Развіццё дзейнасці выражаецца ў паглыбленні яе матываў (усведамленні, пераходзе ад знешніх да ўнутраных), узвышэнні мэт, паляпшэнні выкарыстаных сродкаў і ўдасканаленні псіхічнага вобраза [7, с. 54—55]. У сувязі з тым, што матывы і мэты з'яўляюцца важнымі кампанентамі сістэмы самарэгуляцыі, дынаміка матывацыйна-мэтавай самарэгуляцыі як сістэмы будзе вызначацца як узбагачэннем саміх матываў і мэт, так і зменамі ў суадносінах матываў і мэт.

Апора на існуючыя ў айчыннай псіхалогіі сцвярджэнні дыялектычнага адзінства змястоўных і дынамічных бакоў матывацыі любой, у тым ліку і вучэбнай дзейнасці (В. Г. Асееў, В. І. Селіванаў, А. М. Лявонцьеў, А. К. Маркава ды інш.), дазваляе разглядаць дынаміку матывацыйнага кампанента сістэмы самарэгуляцыі як змены яго змястоўных і дынамічных характарыстык. У працэсе вывучэння дынамікі змястоўных характарыстык матывацыі вучэбнай дзейнасці асноўная ўвага сканцэнтравана на выяўленні дамінуючых матываў у іерархіі матываў, а таксама ўсвядомленасці і самастойнасці матываў. Вывучэнне вядучых матываў дазволіць вызначыць суб'ектыўную значнасць вучэбнай дзейнасці на розных стадыях навучання, выявіць змены ў суадносінах матываў і мэт, у спецыфіцы сістэмы самарэгуляцыі.

Даследаванне самастойнасці матываў мае вялікае значэнне ў працэсе вывучэння матываў выбару прафесіі і матываў вучэбнай дзейнасці. Вывучэнне такой змястоўнай характарыстыкі, як усвядомленасць матываў, дазволіць вызначыць асаблівасці асэнсавання студэнтамі адпаведнасці суб'ектыўных якасцяў асобы патрабаванням сучаснай вучэбнай і будучай прафесійнай дзейнасці.

У ходзе вывучэння дынамікі функцыянальна-энергетычных характарыстык матывацыі лічыцца неабходным выяўленне ўстойлівасці матываў вучэбнай дзейнасці, а таксама іх мадальнасці («дасягненне» ці «пазбяганне»).

Даследаванне дынамікі мэтавага кампанента сістэмы самарэгуляцыі прадугледжвае вывучэнне зместу саміх мэт, суадносін агульных, дакладных і дакладна-аперацыянальных мэт.

Змены ў суадносінах матываў і мэт у сістэме самарэгуляцыі прадугледжваюць іх класіфікацыйную адпаведнасць, а таксама супадзенне матываў і мэт, якое ажыццяўляецца ў працэсе ўсведамлення суб'ектам матываў дзейнасці на аснове аналізу сябе, дзейнасці і «сябе ў дзейнасці». Супадзенне матываў і мэт характарызуецца таксама з'яўленнем у фармулёўках дакладных мэт аперацыянальнага кампанента («зрух матыву на мэту») [8].

Прычынай змен у суадносінах матываў і мэт, актывізацыі сістэмы самарэгуляцыі з'яўляецца пераадоленне суб'ектам «інфармацыйнай нявызначанасці» [9, с. 10]. Інфармацыйная нявызначанасць узнікае ў працэсе параўнання студэнтам сваіх наяўных ведаў, уменняў, навыкаў, якасцяў і патрабаванняў прафесіі. Наяўнасць у студэнта да паступлення ў ВНУ вопыту работы па мяркуемай прафесіі, жадання ажыццяўляць аналіз уласных поспехаў-няўдач, моцных і слабых бакоў вызначае ўсвядомленасць, асэнсаванасць матываў выбару прафесіі і вучэбнай дзейнасці ў ВНУ.

У выніку адсутнасці ў студэнта практычнага вопыту аналагічны інфармацыйны вакуум узнікае ў працэсе праходжання педагагічных практык. Першая спроба сіл уплывае на змены ў сістэме матываў і ў працэсе мэтаўтварэння: павялічваецца колькасць дакладных мэт, звязаных з самаадукацыяй і самавыхаваннем, студэнт імкнецца пабудаваць часавую паслядоўнасць мэт, дзе дасягненне папярэдняй забяспечвае рэалізацыю наступных мэт.

Вывучэнне самарэгуляцыі вучэбнай дзейнасці з апорай на прынцып суб'ектнасці дазваляе не толькі аналізаваць асобу студэнта са складанай сістэмай матываў і мэт, але таксама выявіць змены, якія адбываюцца ў асобе і ў сістэме самарэгуляцыі пад уплывам вучэбнай дзейнасці. Патрабаванні вучэбнай дзейнасці вызначаюць змены, накіроўваюць дзеянні і працэс пазнання суб'екта. Спосаб уключэння ў дзейнасць, усведамленне матываў і патрэбнасцяў, вызначэнне і фармуляванне мэт, прыняцце рашэнняў у працэсе дасягнення мэт характарызуюць суб'екта дзейнасці і суб'екта працэсу самарэгуляцыі.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. *Карандашев Ю. Н.* Психология развития: Введение. Мн., 1996. С. 240.

2. *Чуприкова Н. И.* Умственное развитие и обучение. Психологические основы развивающего обучения. М., 1995. С. 192.

3. *Рубинштейн С. Л.* Бытие и сознание. М., 1957. С. 327.

4. *Ломов Б. Ф., Сурков Е. Н.* Антиципация в структуре

деятельности. М., 1980. С. 279.

5. *Зимняя И. А.* Педагогическая психология: Учеб. пособие. Ростов н/Дону, 1997. С. 480.

6. *Дьяченко М. И., Кандыбович Л. А.* Психология высшей школы. Мн.,1978. С. 320.

7. *Петровский В. А.* Личность в психологии: категория субъектности. Ростов н/Дону, 1996. С. 512.

8. *Леонтьев А. Н.* Деятельность. Сознание. Личность. 2-е изд. М., 1977. С. 304.

9. *Конопкин О. А.* Психологическая саморегуляция произвольной активности человека //Вопросы психологии. 1995. № 1. С. 5—12.

SUMMARY

*In the article the dynamics of motivational-purposal self-regulation of student educational activity is analyzed. The development of self regulation is caused by formation of subjective qualities of students, by enriching motives and purposes and by changes in motive and purpose correlations.*